ством внутренних дел. В служебном подчинении у исправника находились становые приставы. Нижними чинами уездной полиции оставались сотские и десятские [6].

Всякие реформы местной полиции в конечном итоге были связаны с ужесточением карательной политики царизма, нежеланием предоставить должную самостоятельность местным органам управления из опасения роста вольнодумства и бесконтрольности в обывательской среде.

Сложное внутреннее положение империи в начале XX в., обострение социальных противоречий заставило правительство постоянно искать пути укрепления и усиления местной полиции.

Последняя попытка такого рода была предпринята в марте 1913 г., когда в Совет министров поступил от Министерства внутренних дел проект плана преобразования полиции в империи. Однако реализации плана помешали внешнеполитическая нестабильность и внутренние потрясения. Как известно, они привели в конечном итоге к ликвидации самодержавия и совершенному разрушению его опоры – полиции.

Библиографические ссылки

1. Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России. М., 1983.
2. История органов внутренних дел Беларуси : хрестоматия / под ред. А.Ф. Вишневского ; М-во внутр. дел Респ. Беларусь, Акад. МВД. Минск : Акад. МВД Республики Беларусь, 2009.
3. Киселев А.А. Структура, состав и деятельность земской полиции белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. Минск : Экономпресс, 2006.
4. Ключевский В.О. Сочинения : в 9 т. М. : Мысль, 1989. Т. 5 : Курс русской истории.
5. Мулукаев Р.С. Полиция и тюремные учреждения дореволюционной России. М., 1964.
6. Рент Ю.А. Общая и политическая полиция России (1900–1917 гг.). Рязань, 2001.
7. Сизиков М.И. История полиции России (1718–1917 гг.). М., 1992.
8. Троцкий И.М. III отделение при Николае I. Л., 1990.
9. Шелкопляс В.А. Полицейские реформы в России 60-х годов XIX века. Минск, 1981.
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск : Беларус. энцыкл., 1993–2003.

Дата поступления в редакцию: 29.10.2011

УДК 930

***А.М. Сувалаў***, *старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*

## ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАГА РЭГІЁНА І ПРАБЛЕМА ЭТНАГЕНЕЗУ БЕЛАРУСАЎ У 60–90-я гг. XIX ст.

*Разглядаюцца асаблівасці вывучэння беларускага рэгёна ў час пасля паўстання 1863–1864 гг. і перыяду другой паловы XIX ст., калі інтарэс да беларусаў і іх этнічнага паходжання набывае яскрава палітызаваны характар. Этнагенезам беларусаў цікавяцца не толькі вучоныя, але і ўрадавыя структуры, якія маюць за мэту не разгляд самой праблемы, а навуковае абгрунтаванне ідэалагічна выгоднай схемы мінулага Беларусі. Разам з тым менавіта ў гэты перыяд фарміруецца і першая навуковая канцэпцыя этнагенезу беларусаў – канцэпцыя Я.Ф. Карскага.*

*Features of investigation of the Belarusian region after revolt of 1863–1864 the second half of 19th century are considered in the article. At that period politicians were extremely interested in researching of the Belarusians and their ethnic origin. Not only scientists were interested in researching of ethno genesis of Belarusians, but Russian government agencies too, who have no consideration for the purpose of the problem, but the scientific justification of ideologically advantageous theory of the Belarusians history. On the other hand during this period the first scientific conception of ethno genesis of the Belarusians – the E. Karski conception was formed.*

Галоўнай, вызначаючай асаблівасцю вывучэння беларускага регіёна ў 60–90-я гг. XIX ст. стаў значны рост цікавасці да Беларусі з боку шырокіх колаў грамадства і вучоных. Азначаны рост быў выкліканы, перш за ўсе, палітычнымі падзеямі – паўстаннем 1863–1864 гг. Па прызнанню расійскага вучонага і этнаграфа А. Пыпіна: «З часу польскага паўстання адносна беларускай народнасці зроблена было ледзьве не адкрыццё: маса (рускага. – *А.С.*) грамадства, якая раней мела вельмі цмянае ўяўленне аб заходнім краі... раптам захапілася меркаваннем, што гэты край – рускі. Гэтае меркаванне было для большасці нібыта навіною, і гэта навіна дбайна прапагандавалася: да мерапрыемстваў адміністрацыйных, зацвярджаючых рускія якасці края, дадаліся ў тым жа сэнсе мерапрыемствы публіцыстычныя, і вучоныя – у галіне археалогіі (маецца на ўвазе археаграфія. – *А.С.*) і этнаграфіі. Даказвалася не толькі тое, што край гэты рускі, але што заходнеруская або беларуская народнасць нават не існуе: да такой ступені яна складае

адзінае рускае племя без усялякага адрознення ад яго карэннай масы, што «Беларусь» ёсць толькі «геаграфічны тэрмін»» [13, с. 8].

Падаўленне паўстання 1863–1864 гг. не прывяло да хуткай адмены выключных законаў, якія былі ўведзены ў час барацьбы з паўстанцамі. Барацьба працягвала ажыцяўляцца мірнымі сродкамі і мела на мэце знішчэнне польскага ўплыву ў краі. Пасля адмены ваеннага становішча выключныя законы працягвалі сваё існаванне і развіліся ў цэлую сістэму падаўлення нярускага элемента ў краі. Асаблівасцю гэтага часу з'яўлялася тое, што меры па барацьбе з польскім уплывам у сваёй большасці ішлі не праз урадавыя распараджэнні, а праз распараджэнні і цыркуляры мясцовай адміністрацыі.

Адным з крокаў у гэтым накірунку стала забарона выкладання на польскай мове і выдання кніг лацініцай. У той час значная частка беларускіх кніг і брашур друкавалася лацінскім («польскім») шрыфтам, таму гэта забарона тычылася ў роўнай ступені і беларускага друку. Больш таго, паколькі беларусы лічыліся ўрадавымі чыноўнікамі часткаю рускага (або велікарускага) народа, то згодна з іх уяўленнямі павінны былі карыстацца велікарускаю моваю і пры друкаванні сваіх кніг. Спробы ўвесці беларускую мову нават кірылічным шрыфтам у друкаваныя выданні блакіраваліся цэнзураю. Выкарыстанне нацыянальных моў у друку лічылася «літаратурным сепаратызмам», які ў далейшым мог паспрыяць станаўленню ідэй палітычнага сепаратызму.

Сістэма, створанная М. Мураўёвым пасля падаўлення паўстання, дзейнічала дастаткова паспяхова. Настолькі паспяхова, што нават на канец 70-х – пачатак 80-х гг. XIX ст. рэальнага сепаратызму ў літаратурнай сферы ў Беларусі расійскія даследчыкі не бачылі [10, с. 18–19]. Беларускія тэксты маглі друкавацца толькі ў выглядзе прыкладаў мясцовага фальклору. Беларускія выданні кшталту «Dudki Biełaruskaj» забараняліся цэнзураю і на прыканцы XIX ст. [18, с. 124].

Пры прыёме на працу служачых у «Паўночна-Заходнім краі» перавага аддавалася «сапраўды рускім» людзям з цэнтральных губерній Расіі. Палякі, дакладней, каталікі выдаляліся з займаемых пасад пад усялякімі прадставамі. І. Карнілаў – папячыцель Віленскай вучэбнай акругі – у справаздачы за 1863 г. прапаноўваў вучэбным установам наогул пазбягаць мясцовых ураджэнцаў без розніцы іх веравызнання. Выключэнне рабілася толькі для праваслаўных папоў [8, с. 9, 139].

У 1865 г. у Санкт-Пецярбургу з вышэйшых урадавых асоб была ўтворана камісія для разгляду прапаноў аб мерах па «насаджэнні» («водворению») рускага элемента ў «Заходнім краe». Русіфікацыя «Паўночна-Заходняга края» праходзіла пад лозунгам яго спрадвечнай праваслаўнасці, а праз гэта – гістарычнай і этнічнай прыналежнасці да Расіі [9, с. III, IV, V]. Шмат хто ў той час бачыў неадпаведнасць такога падыхода. Напрыклад, Ляліва (Антон Тышкевіч) заўважаў, што «Заходні край», калі ён край рускі, то яму не патрабуецца «абрусенне». І таму «скрайнія мерапрыемствы павінны б да відавочнасці з'яўляцца непатрэбнымі і не маючымі мэты» [11, с. 222].

Для вывучэння беларускага краю паўстанне 1863–1864 гг. і наступіўшая пасля яго рэакцыя мелі надзвычай важныя наступствы. Па прызнанню П. Бяссонава, пасля «апошняга пагрому» (паўстання 1863–1864 гг.) мясцовых даследчыкаў «нібыта чымсці змыла з твару зямлі, нібыта зняла і ўзяла чыесці рукою» [1, с. XXVIII]. Але ў той жа час большую навуковую зацікаўленасць да неспакойнага ў палітычным плане рэгіёна пачынаюць праяўляць расійскія вучоныя і, што вельмі важна, урадавыя колы імперыі. Расійскі ўрад праяўляў цікавасць практычна да ўсіх бакоў даследчыцкай дзейнасці па вывучэнню Паўночна-Заходняга края.

З пачатку 30-х і да сярэдзіны 50-х гг. XIX ст. ідэалогіяй расійскага самаўладдзя з'яўлялася «тэорыя афіцыйнай народнасці». Тэорыя, выкліканая неабходнасцю абгрунтавання непахістнасці існуючага дзяржаўнага і грамадскага ладу, была створана графам С.С. Уваравым з удзелам М.П. Пагодзіна, М.Г. Устралава, С.П. Шэвырова і інш. Так, М.П. Пагодзін казаў аб асаблівым шляху развіцця Расіі, шляху, які адрозніваўся ад гісторыі краін Захаду. Ідэя аб асаблівым пачатку гісторыі Расіі праз дабраахвотнае прызнанне варагаў і прыняцце хрысціянства ад Візантыі стала пасылкаю і сутнасцю тэорыі Уварава і яго прыхільнікаў. Зразумела, што памежны беларускі рэгіён павінен быў быць выкарыстаны ў якасці аднаго з аргументаў на карысць тэорыі графа С.С. Уварава. Схема гістарычнага развіцця Беларусі па М.П. Пагодзіну выглядала наступным чынам. Пакуль Беларусь развівалася ў кантэксце ўсходнеславянскім – гісторыя рэгіёна адпавядала «правільнаму варыянту», а калі ж сюды «прыходзіць» Польшча (маецца на ўвазе Рэч Паспалітая, якая ўспрымалася як уласна польская дзяржава) з яе лацінствам і паланізацыяй – рэгіён прыходзіць у заняпад, церпіць ганенні і чакае дапамогі ад вольнага ўсходнеславянскага свету.

Мясцовай разнавіднасцю велікарускага падыходу да Беларусі стаў «заходнерусізм». Прадстаўнікі «заходнерусізма», так званыя «заходнерусы», былі па сваім паходжанні беларусамі (калі разглядаць уласна беларускі рэгіён), аднак па палітычных і навуковых перакананнях, яны выступалі з пазіцый афіцыяльнай народнасці, з пазіцый адзінства ўсходнеславянскага («рускага») народа. Найбольш дакладна і лаканічна крэда «заходнерусаў» выказана М. Каяловічам: «...ці не лепш рабіцца велікарусам, а не палякам, ці не лепш прыстаць да дужага, чымсці да слабага, ці не лепш зліваццa з магутнаю, спакойнаю Расіяй, чым са слабаю… Польшчаю?» [10, с. 11].

У шэрагу асоб і дзеячоў «заходнерусізма» бадай адзін М. Каяловіч унікальна сумяшчаў у сабе выдатныя навуковыя здольнасці з адкрыта рэакцыйнымі палітычнамі перакананнямі. Прафесар А. Цвікевіч, якога нельга нават западозрыць у прыхільнасці да «захаднерусаў», падкрэсліваў, што па багацці гістарычнага матэрыялу і распрацоўцы першарадных архіўных крыніц даследаванне М. Каяловіча «Літоўская царкоўная ўнія» павінна быць прызнана адным з лепшых у сваім родзе [19, с. 150]. А А.П. Сапуноў лічыў М. Каяловіча Калумбам, які адкрыў рускаму грамадству Беларусь [14, с. 2].

Тыя працы і падборкі дакументаў, якія выдаваліся дзеячамі «заходнерускага» накірунку часта практычна толькі з адной мэтай – давесці правы Расіі на гэтыя землі і тым самым абгрунтаваць правамоцнасць дзеянняў расійскага ўрада ў адносінах да Беларусі, пэўным чынам спрыялі абуджэнню інтарэса грамадскасці да гэтых зямель, стымулявалі развіццё навуковай і грамадскай думкі. Шмат хто з ліку «заходнерусаў» і нават славянафілаў, якія былі перакананы ў прыналежнасці беларусаў да вялікарускага або рускага племя, паспрыялі гэтаму працэсу. Больш таго, яны прыязна і нават з пяшчотаю адносіліся да адметнасцяў беларусаў і ўнеслі свой уклад у іх вывучэнне. Але для большасці «заходнерусаў» і славянафілаў былі каштоўныя не беларусы самі па сабе, са сваёй цэльнай культураю, моваю і гісторыяй, а тыя старажытныя славянскія або ўсходнеславянскія («рускія») асаблівасці і рысы, што, па іх меркаванню, захаваліся ў Беларусі ў чысціні. Для гэтага беларусы мелі ў лепшым выпадку «слаўнае мінулае», але не мелі будучыні без паступовай дэнацыяналізацыі і трансфармацыі іх у «сапраўды рускіх людзей».

Працягвае захоўвацца ранейшая традыцыя атаясамлення Рэчы Паспалітай з Польшчаю (указаная традыцыя не была пераадолена на працягу ўсяго разглядаемага перыяду) [2, с. 2]. Традыцыйна шляхецкая і буржуазная польская гістарыяграфія глядзелі на Беларусь і наогул ВКЛ як на адну з правінцый Польшчы. Як слушна адзначалі беларускія савецкія даследчыкі, польскі нацыянальна-вызваленчы рух XIX ст. меў нацыяналістычную афарбоўку і галоўным лозунгам польскай шляхты было патрабаванне далучэння Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны да Польшчы [17, с. 73]. Ідэя адраджэння Рэчы Паспалітай як польскай дзяржавы «ад мора да мора» патрабавала свайго навуковага абгрунтавання. Таму непрызнанне этнічнай самастойнасці беларусаў і далучэнне іх да ліку польскага народа ў польскай гістарыяграфіі разглядаемага часу трэба звязваць не столькі з узроўнем развіцця навуковых даследаванняў, колькі з ідэалогіяй.

У другой палове XIX ст. палітычна-гістарычная канцэпцыя «агульнага» польскага народа як шматэтнічнага ўтварэння, што нібыта складаўся ня толькі з вялікапалянаў і мазураў, але і таксама з літвінаў, жамойтаў, украінцаў і г. д., натыкалася на ўсё больш рашучы супраціў з боку прадстаўнікоў паасобных нацый, якія ў Рэчы Паспалітай XVIII ст. арбітальна ўключаліся ў паняцце польскасці. Гэты працэс знайшоў сваё адлюстраванне таксама ў тэрытарыяльных памкненнях, што абгрунтоўваўся вядомым пастулатам: каб мець магчымасць існаваць і развівацца, кожны сучасны народ мусіць мець сваю дзяржаву. Менавіта такое імкненне пачалі праяўляць літоўцы, украінцы і беларусы. Канцэпцыя ж адраджэння Польшчы ў межах 1772 г., якая праіснавала бадай да 1918 г., аказалася абсалютным анахранізмам у эпоху ваяўнічых нацыяналізмаў і таталітарызмаў [23, s. 101, 133–152].

Указаны перыяд адзначаецца ростам і палітычным афармленнем нацыянальных рухаў такіх народаў, як украінцы, беларусы і літоўцы. Нацыянальная ідэалогія, да фарміравання якой спрычыніліся К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч, гоманаўцы, а ў пазнейшы час дзеячы БСГ і «Нашай нівы» ды інш., дала штуршок да росту навуковых распрацовак з пазіцый беларусаў. З'яўленне пэўнай нацыянальнай ідэі ў даследчыцкай дзейнасці стала адным з галоўных фактараў фарміравання першай навуковай канцэпцыі этнагенезу беларусаў, распрацаванай Я.Ф. Карскім.

Значны прагрэс адбываецца ў развіцці навук і дысцыплін, неабходных для значна больш глыбокага, чымсці на пачатку XIX ст., разумення працэсаў гістарычнага і этнічнага развіцця Беларусі. З канца XIX – пачатку XX ст. можна казаць аб панаванні іншых крытэрыяў пры

складанні карт і вызначэнні этнічных тэрыторый. У якасці такіх выступала ў першую чаргу мова мясцовага насельніцтва. На аснове гэтага крытэрыя былі пабудаваны карта Я. Карскага (яна была прыкладзена да першага тому «Беларусаў», пазней апублікавана асобным выданнем [7], і карта, складзеная пад рэдакцыяй Д. Ушакова [6]. Тым не менш у грамадскай свядомасці падзел па прынцыпу: каталік – паляк, праваслаўны – рускі, – захоўваўся і надалей.

Этнонім «літвіны» ў дачыненні да беларусаў вядомы з часоў ВКЛ і звязаны з перанясенням назвы краіны (палітоніма) на ўсё падуладнае дзяржаве насельніцтва. Паколькі выключная большасць насельніцтва ВКЛ былі этнічнымі славянамі [22, s. 390], гэты тэрмін набывае славянскае «гучанне». Тое, што літвіны былі славянамі сцвярджаў, напрыклад, В. Тацішчаў, заўважаючы, што яны карыстаюцца славянскаю моваю [16, с. 178]. Традыцыя называць беларусаў «літвінамі», а іх мову «літоўскаю» была даволі ўстойліваю. Па сведчанню П. Бяссонава, у 50-я гг. XIX ст. назвы «Літва», «літоўцы», «літоўскае» мелі ў дачыненні да Беларусі і беларусаў шырокае распаўсюджанне [1, с. XXV]. Найбольш працяглы час (па меншай меры да пачатку XX ст.) яна захоўваецца ў украінцаў для абазначэння беларускага насельніцтва і ў часткі беларусаў у якасці саманазвы. Як вандроўнікі, гэтак і даследчыкі не аднойчы звярталі на гэта ўвагу. Напрыклад, К. Гамалія зазначаў: «У нас на Украіне, хто яго ведае ад чаго, празываюць беларусаў літвінамі» [3, с. 8]. А рускі вандроўнік П.П. Свіньын, кажучы пра маларусаў, рабіў заўвагу, што іх мова за Чарнігавым змяняецца на літоўскую [15, с. 313–314]. Практычна тое ж можна пабачыць і ў М. Дамантовіча [5, с. 532–534]. Важным для разумення праблемы было тое, што назва «ліцвіны» ў XIX ст. з'яўлялася для беларусаў не этніконам (назваю, нададзенаю этнасу іншым этнасам, інакш кажучы, назваю, дадзенаю «з боку»), а этнонімам (саманазваю беларускага этнасу). Ёсць сведчанні аб захаванні «ліцвінскай» самасвядомасці на Беларусі нават у савецкі час. Так у 1920-х гг. жыхары Навазыбкаўскага павету ў час іх апытання сцвярджалі, што пражываюць у Літве [12, с. 3].

Выдзяленне палешукоў як асобнай назвы насельніцтва Беларусі ў XIX ст. сустракаецца радзей. Тым не менш у этнаграфічнай літаратуры і ў нататках вандроўнікаў насельніцтва прыпяцкага басейна як правіла выдзялалася асобна пад імем «палешукі». У прыватнасці, беларускі этнограф П. Шпілеўскі аддзяляў беларусаў ад палешукоў, а Беларусь ад Палесся [20, с. 43, 48, 51]. Тое ж можна сказаць і аб польскіх аўтарах канца XIX ст., напрыклад пра М. Федароўскага [21, s. 7].

Распаўсюджанне тэрмінаў «Беларусь» і «беларусы» на ўсю этнічную тэрыторыю Беларусі адбываецца ў другой палове XIX ст. у сувязі з развіццём беларусазнаўства. Актыўныя пабornікі «русіфікацыі» рэгіёна выступалі супраць распаўсюджання гэтага імя і імкнуліся да яго замены на «Заходнюю Расію», паколькі для іх беларусы – гэта «той жа рускі народ» [4, с. VI]. Але гэтая забарона не распаўсюджвалася на навуковыя даследаванні. Таму можна казаць аб тым, што менавіта дзякуючы шырокаму выкарыстанню ў навуцы тэрмінаў «Беларусь» і «беларусы» яны замацоўваюцца і пашыраюцца ў грамадскім ужытку.

Такім чынам, пры захаванні значнага ўплыву ідэалогіі і палітыкі на вывучэнне беларускага рэгіёну перыяд 60–90-х гг. XIX ст. мае адрозненні ад ўмоў першай паловы ўказанага стагоддзя. Паўстанне 1863–1864 гг. і наступіўшая рэакцыя значна скарацілі колькасць мясцовых вучоных – даследчыкаў беларускага рэгіёна. Тым не менш указаныя падзеі стымулявалі інтарэс да Беларусі хай сабе і ў празмеры запалітызаваным варыянце. Канчаткова аформілася плынь «заходнерусізму», якая ў далейшым адыграла значную ролю ў пабудове этнагенетычных канцэпцый. Указаны час характарызаваўся і паўстаннем уласна беларускай ідэалогіі з яе галоўным атрабаваннем прызнання беларусаў у якасці самастойнага народа.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Бессонов П. Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта. М. : Тип. Бахметева, 1871.

2. Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собраные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния : в 2 ч. СПб. : Гл. упр. Генер. штаба, 1863. Ч. 1.

3. Гамалия К. Белоруссия и Литва. Киев, 1888.

4. Документы, объясняющие историю западно-русского края и его отношения к России и к Польше / собрал док. и составил исслед. М. Коялович. СПб. : Тип. Э. Праца, 1865.

5. Домонтович М. Материалы для географии и статистики России, собраные офицерами генерального штаба. Черниговская губерния. СПб. : Тип. Ф. Персона, 1865.

6. Дурново Н.Н., Соколов Н.Н., Ушаков Д.Н. Труды Московской диалектологической комиссии. М. : Синод. тип., 1915. Вып. 5 : Опыт диалектологической карты русского языка в Европе (с приложением очерка русской диалектологии).

7. Карский Е.Ф. Этнографическая карта белорусского племени. СПб. : Тип. Рос. акад. наук, 1917.

8. Корнилов И.П. Памяти графа М.Н. Муравьева : К истории Виленского учебного округа за 1863–1868 гг. СПб. : Тип. Комарова, 1898.
9. Корнилов И.П. Русское дело в Северо-Западном крае. СПб. : Тип. А.П. Лопухина, 1901.
10. Коялович М.О. Чтения по истории Западной России. СПб. : Тип. А.С. Суворина, 1884.
11. Лелива. Русско-польские отношения. Лейпциг : Каспрович, 1895.
12. Полевой А. О языке населения Новозыбковского уезда Гомельской губернии. Минск : 1-я Гостип., 1926.
13. Пыпин А.Н. История русской этнографии : в 4 т. Минск : БелЭн, 2005. Т. 4 : Белоруссия и Сибирь.
14. Сапунов А. Белоруссия и белорусы. Витебск, 1910.
15. Свиньин П.П. Картины России и быт разноплеменных ее народов, из путешествий П.П. Свиньина. СПб. : Тип. Н. Греча, 1839.
16. Татищев В.Н. Избранные труды по географии России. М. : Географгиз : 16 тип. Союзполиграфпрома, 1950.
17. Улащик Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М. : Наука, 1973.
18. Хмельницкая Л.В. Эволюция взглядов А.П. Сапунова на проблему самоопределения белорусов // Русь – Литва – Беларусь : Проблемы национального самосознания в историографии и культуралогии. М. : Наследие, 1997.
19. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм» : Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. 2-е выд. Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
20. Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Минск : Полымя, 1992.
21. Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. Kraków : Akademia Umiejętności, 1903. Tom III : Baśnie, przypowieści i podania ludu z okolic Wołkowyska, Słonima, Lidy i Sokółki. Część II : Tradycye historyczno-miejscowe oraz powieści obyczajowo-moralne.
22. Łowmiański H. Studia nad dziejami Wielkiego księstwa Lietewskego. Poznań : Wydaw. Naukowe uniw. im. A. Mickiewicza, 1983.
23. Wapiński R. Polska i małe ojczyzny polaków. Wroclaw : Ossolineum, 1994.

Дата поступления в редакцию: 24.01.2011

УДК 340.1

***В.П. Шиенок**, доктор юридических наук, профессор, профессор кафедры теории и истории государства и права Академии МВД Республики Беларусь*

## МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКИЕ И ИНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОЗДАНИЯ НОВОЙ МЕТОДОЛОГИИ БЕЛОРУССКОЙ ЮРИСПРУДЕНЦИИ

*Рассматриваются вопросы современного состояния методологической основы отечественной юридической науки под углом зрения геополитических, экономических и социальных изменений, вызванных распадом СССР. Обосновывается ведущая роль мировоззрения исследователей в структуре методологии науки. В целях создания основ новой методологии предлагается для осмысления ряд философских категорий гуманистической направленности.*

*The questions of modern state of methodological basis of native legal science are examined at the angle of view of geopolitical, economical and social changes after the USSR destruction. The main role of scientists' world-view in the science methodology structure is substantiated. The range of humanistic direction philosophic categories is proposed for conception for the purpose of new methodology creation.*

Важнейшим общественно-политическим событием планетарного масштаба второй половины XX в., безусловно, является распад Советского Союза и мировой системы его стран-сателлитов. Главное значение факта крушения СССР для существовавшей системы науки в целом и советской юриспруденции в частности является не разрушение ее материально-технической, финансовой, организационной базы (хотя и это крайне важно), а утрата ею идеологического фундамента и соответственно единой методологической основы. Распад советского государства, с одной стороны, явился прямым следствием процесса девальвации официальной идеологии (системы ценностей, идей и принципов) в общественном и индивидуальном сознании. С другой стороны, кардинальное изменение экономико-правовой ситуации ознаменовало собой финальную стадию разрушения старой мировоззренческой модели на уровне общества и индивида. Для советских общественных наук крах СССР в первую очередь означал открытую фазу системного методологического кризиса, обусловленного несоответствием базовых мировоззренческих ценностей, идей и принципов реальному ходу общественной жизни и объективным законам мироздания.

Кризис методологии советской науки конца XX в. – это в первую очередь кризис индивидуального человеческого мировоззрения как результат противоречий, накопившихся в общественном и индивидуальном сознании. Говоря иными словами, идеологические постулаты, зако-